№ 18 (80)

# ПАХОДНЯ

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Верасень 2008 г.

***Выбары***

## Рыгор Кастусёў зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты

27 жніўня ў Шклове адбылося паседжанне акруговай выбарчай камісіі Шклоўскай выбарчай акругі № 90. На паседжанні былі зарэгістраваны два кандыдаты ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь: старшыня Шклоўскага райвыканкама Валерый Іваноў і інжынер па тэхніцы бяспекі ТАА “БудАрком” (г. Санкт-Пецярбург) Рыгор Кастусёў.



Рыгор Андрэевіч Кастусёў – наш зямляк, ён нарадзіўся 17 красавіка 1957 года ў вёсцы Цяхцін Бялыніцкага раёна ў простай сялянскай сям’і, тут жа з 1964 па 1974 год навучаўся ў мясцовай школе. Пасля заканчэння школы пачаў працаваць у мясцовым саўгасе “Друць” у якасці рабочага. Быў прызваны ў армію, пасля службы ў якой у 1977 годзе паступіў у Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Пасля заканчэння вучобы у 1982 годзе атрымаў спецыяльнасць інжынера-механіка і вярнуўся ў родную гаспадарку – саўгас “Друць” Бялыніцкага раёна. Працаваў у саўгасе спачатку загадчыкам майстэрні, а потым ужо ў 1983 годзе яму была даверана пасада галоўнага інжынера.

У лютым 1988 на агульным сходзе працаўнікоў саўгаса “Іскра” Бялыніцкага раёна Рыгор Кастусёў быў выбраны дырэктарам гэтай гаспадаркі (зараз ужо няшмат хто памятае, што быў перыяд у жыцці нашай краіны, калі кіраўнікоў не прызначалі, а выбіралі самі працаўнікі). Прадстаўляў кандыдатуру Кастусёва Васіль Мікітавіч Шымбалёў, які ў той час працаваў старшынёй Бялыніцкага РАПА.

На пасадзе дырэктара саўгаса “Іскра” Рыгор Андрэевіч працаваў па 1991 год і многія жыхары Стараселля і навакольных вёсак сталага веку да гэтай пары добрым словам памінаюць былога кіраўніка.

У 1991 годзе ў сувязі з хваробай дзяцей (рэзка пачаў садзіцца зрок) Рыгор Андрэевіч вымушаны быў пераехаць з Бялыніцкага раёна ў Шклоўскі, дзе пачаў працаваць у Шклоўскай МПМК-283 галоўным механікам. У 1995 годзе быў прызначаны дырэктарам Шклоўскага раённага камунальнага прадпрыемства і працаваў на гэтай пасадзе да канца 2001 года. За час працы ў МПМК-283 і “Жылкамгасе” шмат добрага зрабіў па рэканструкцыі і будаўніцтву камунальных аб’ектаў горада Шклова і раёна, асабліва ў час падрыхтоўкі і правядзення свята “Дажынкі” у 1999 і 2000гг., за што быў адзначаны Ганаровай граматай Міністэрства камунальнай гаспадаркі РБ. З працы дырэктара жылкамгаса Рыгор Кастусёў быў вымушаны звольніцца ў кастрычніку 2001 года ў сувязі з ціскам улад за апазіцыйныя погляды, якіх ён ніколі не хаваў.

З 2002 года Рыгор Андрэевіч працаваў дырэктарам ТАА “Гідрасіла-Белая Русь”, з 2004 года стаў прыватным прадпрымальнікам.

***(Заканчэнне на ст. 2)***

# Рыгор Кастусёў зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты

*(Заканчэнне. Пач. на ст. 1)*

. У гэтым годзе ў сувязі з сумна вядомым указам кіраўніка краіны быў вымушаны спыніць прадпрымальніцкую дзейнасць, бо ажыццяўляць рамонт гідраўлічных сістэм сельскагаспадарчай тэхнікі аднаму без дапамогі наёмных рабочых проста немагчыма. Зараз Рыгор Кастусёў працуе інжынерам па тэхніцы бяспекі у расійскім прадпрыемстве “БудАрком”, бо калі ты не хаваеш адрозных ад праўладных поглядаў, знайсці працу ў нашай краіне вельмі цяжка. А Рыгор Андрэевіч актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю і ўжо шмат гадоў (з 2002 года) з’яўляецца старшынёй Магілёўскай абласной арганізацыі БНФ.

Надзейнай апорай для Рыгора Кастусёва з’яўляецца яго сям’я. Са сваёй жонкай Ларысай ён сустрэўся і звязаў свой лёс яшчэ ў далёкім 1979 годзе. Амаль 30 гадоў яны разам. У іх сям’і трое дзяцей – дзве прыгажуні-дачкі і сын. Жывуць яны зараз у Шклове.

На жаль, бацькі Рыгора Андрэевіча ўжо пакінулі гэты свет, але ён незабывае родных мясцін і пастаянна прыязджае ў Цяхцін у бацькоўскую хату (сам Рыгор у гутарках са мной звычайна кажа “дахаты”). Як і ўсе простыя людзі, саджае і вырошчвае на бацькоўскай сядзібе бульбу і агародніну, каб мець нейкую прыбаўку для сямейнага стала.

Я шмат гадоў ведаю Рыгора Андрэевіча Кастусёва. У яго няма мільярдаў грошы, ён сумленна працуе і імкнецца даць вышэйшую адукацыю сваім дзецям. Але ў яго ёсць іншае: шчырасць, працавітасць, прафесіяналізм, справядлівасць. Рыгор Кастусёў сумленны і справядлівы чалавек, які ўсяго ў жыцці дабіваўся сам, ён дасведчаны кіраўнік. Ён ніколі не баяўся начальства, заўсёды мог і ўмеў абараняць інтарэсы простых людзей. І ён не будзе, як другі кандыдат-кіраўнік, які зараз балатуецца па нашай акрузе і які ў перыяд свайго дэпутатства ў Савеце Рэспублікі Нацыянальнага схода РБ абедзвюмя рукамі галасаваў за адмену льгот для пенсіянераў і навучэнцаў, а зараз выстаўляе сябе “народным заступнікам”, прымаць законы, якія пагаршаюць становішча простых людзей.

***Барыс Вырвіч***

## Вытрымкі з праграмы Рыгора Кастусёва:

Справядлівасць – калі ўсе роўныя перад законам – ад пенсіянера да прэзідэнта.

Праца – той, хто можа і хоча працаваць, павінен мець работу.

Дабрабыт – калі кожны чалавек можа ўтрымліваць сям’ю, вучыць дзяцей і годна жыць.

# Анатолий Лебедько:

**Еще одна такая избирательная кампания, и власти будут платить деньги за участие в «выборах по-белорусски»**

Низкую активность претендентов, желающих бороться за депутатский мандат в Палату представителей, руководитель ОГП Анатолий Лебедько считает *«следствием глубокого кризиса белорусской модели выборов».*

«Еще одна такая избирательная кампания, и белорусские власти будут платить деньги за то, чтобы кто-то принял участие в «выборах по-белорусски»», — *заявил он. По мнению политика, существующее избирательное законодательство и практика его применения убивают всякую мотивацию принимать участие в кампании, которая* «не является ни прозрачной, ни честной, ни демократической».

Как сказал политик, почти одна треть претендентов в кандидаты — это те, кому обещано место в **Палате представителей**. *«Но даже среди них найдутся те, кому сказали «надо»,* — отметил **Анатолий Лебедько**. — *Еще примерно столько — представители* **ОДС**, *для которых это скорее вопрос партийной дисциплины, нежели личной потребности».*

По словам руководителя **ОГП**, на всю страну нашлась всего лишь сотня желающих поучаствовать в избирательной кампании. *«Избирателя можно обмануть раз, можно два, но нельзя держать людей за дураков все время. Без реформы избирательной системы вернуть доверие к выборам невозможно»,* — подчеркнул **Анатолий Лебедько**.

***ucpb.org***

*Выбары*

# Магілёўскія дэмакраты будуць на выбарах канкураваць між сабой

У Магілёве дэмакратычныя актывісты падсумавалі першыя вынікі ўдзелу ў парламенцкай кампаніі. З 24 ініцыятыўных групаў подпісы здолелі здаць толькі 20. Таксама высвятлілася, што дэмакраты ідуць на выбары дзвюма калонамі.

У Магілёве на фінішную прамую выйшлі не ўсе. Чатыры прэтэндэнты не вытрымалі ціску з боку сілавых органаў. Пра тое, як прахадзіў збор подпісаў распавёў кіраўнік абласной арганізацыі БНФ Рыгор Кастусёў, ён першым зарэгістраваў сваю ініцыятыўную групу, і адпаведна, мае пасведчанне за №1:

"З боку сілавых структураў праблемаў было вельмі шмат. Да Барыса Вырвіча – гэта кіраўнік маёй ініцыцятыўнай групы, неаднаразова наведваліся і супрацоўнікі міліцыі, і супрацоўнікі КДБ. І нават бралі на аналіз сліну і адбіткі пальцаў менавіта ў момант збору подпісаў. Акрамя таго, мяне запрашаў на размову падпалкоўнік міліцыі са Шклоўскага РАУС Піменаў Аляксандар – з прапановай, каб я прыйшоў і здаў адбіткі пальцаў і сліну. Ён мне паказаў афіцыйны ліст, які прыйшоў з Магілёўскага аблупраўлення МУС, загад зрабіць такія рэчы са мной".

## Двума рознымі калонамі

Аднак ціск з боку ўладаў – не адзіная праблема для мясцовых дэмакратаў. Высветлілася, што магілёўцы ідуць на выбары двума рознымі калонамі. Кіраўнік выбарчага штаба Магілёўскай кааліцыі Юрый Новікаў не хавае таго, што дэ-факта падзел існуе:

"Дваццаць прэтэндэнтаў у кандыдаты, сярод іх: два сябра Партыі БНФ, два сябра АГП, адзін сябра партыі БСДП "Грамада", і 15 беспартыйных кандыдатаў. Калі глядзець у такім ракурсе, колькі сябраў вылучана ад АДС, і колькі ад кампаніі "Еўрапейская Беларусь", то тут расклад такі: 9 чалавек – гэта так званыя, "адзіныя" кандыдаты ад АДС на 13 акругаў па Магілёўскай вобласці, і 11 чалавек – гэта прадстаўнікі кампаніі ""Еўрапейская Беларусь".

## Дэмакраты сумняваюцца ў сваіх сілах?

Разыходжаньне ў падыходах да тактыкі выбараў выявіліся практычна адразу з іх абвяшчэннем. Каардынатар Магілёўскай кааліцыі грамадскапалітычных сілаў Аляксандар Сілкоў жорстка крытыкуе прапанову Палітсавета АДС выбіраць "адзінага" кандыдата дый рыхтуецца ўжо да другога тура выбараў:

"Многие наши лидеры демократии, которые находятся наверху, к сожалению, очень рано поверили, что они стали очень большими и значимыми людьми. Это самая непростительная ошибка: один округ – один кандидат. Непростительная! Потому что будет два тура, главная цель сейчас – представителю власти не дать победить в первом туре, а во второй тур будут выходить уже наши люди. Хотим мы или не хотим, демократы, которые шли разными колоннами, хоть пошли с людьми разговаривать – вот это и есть работа. И ещё другой момент, может быть самый страшный, но нужно признаваться – если бы сейчас проводились честные, демократические выборы, то я не уверен, что мы победили бы в 50% участков".

## На ўзроўні вобласці супярэчнасцяў няма

Магілёўцы рухаюцца наперад сваім шляхам. Толькі пасля рэгістрацыі кандыдатаў плануецца правядзенне адмысловага паседжання, дзе магчыма частка дэмакратычных актывістаў адмовіцца ад далейшай барацьбы на карысць сваіх калегаў – толькі такім чынам, могуць з'явіцца "адзіныя" кандыдаты. А што датычна непаразуменняў, то яны існуюць толькі ў мінскіх офісах палітычных партыяў. Юрый Новікаў кажа, што на ўзроўні вобласці ніякіх праблемаў няма:

"Гэта не ад нас залежыць. Усе мы належым да пэўных палітычных структур, але ў маштабах Магілёўскай вобласці ў нас няма ніякіх супярэчнасцяў. Мы працуем усе разам, і я лічу, што тактыка, абраная Магілёўскай абласной кааліцыяй, сябе цалкам апраўдала".

***Аляксандар Буракоў***

## *Анекдот дня*

Центризбирком не позволит избирателям сфальсифицировать итоги выборов.

*Эканоміка*

# На газовом крючке

**Повышение цены на газ до 200 долларов приведет к катастрофическим последствиям для экономики Беларуси. Убыточными станут 37% предприятий, в том числе такие промышленные киты, как «Полимир», «Гродно Азот», «Могилевхимволокно». Это следует из закрытого правительственного прогноза, попавшего в руки журналистов.**

В распоряжении еженедельника "Белорусы и рынок" оказался документ, в котором официальный Минск аргументирует необходимость пересмотра договоренностей по методике формирования цены на газ. При их заключении в 2006 году принимался во внимание прогноз Минэкономразвития и торговли РФ (МЭРТ), который предусматривал снижение мировых цен на нефть в 2007-2009 годах (цена на газ привязана к цене на нефть).

Исходя из этого среднегодовая цена поставляемого в Беларусь газа рассчитывалась так:

в 2008 году — 120 USD за тысячу кубометров
в 2009 году — 140 USD/тыс. куб. м
в 2010 году — 159 USD/тыс. куб. м
в 2011 году — 178 USD/тыс. куб. м.

Но МЭРТ РФ ошиблось: цены на нефть не упали, а выросли. Соответственно, согласно новым расчетам, среднегодовая цена на газ составит:

в 2008 году — 126 USD/тыс. куб. м
в 2009 году — 203 USD/тыс. куб. м
в 2010 году — 259 USD/тыс. куб. м
в 2011 году — 306 USD/тыс. куб. м.

Таким образом, начиная с 2009 года разница становится более, чем существенной. По мнению белорусской стороны непредвиденный рост цен на газ будет иметь катастрофические последствия для экономики страны.

Если в 2007 году доля убыточных организаций оценивалась на уровне 11%, то в 2009 году она, согласно правительственным прогнозам возрастет до 37,1%, а в 2011 году — до 60,5%.

По мнению правительственных экспертов, уже в текущем году станут убыточными все цементные предприятия — Белорусский цементный завод, «Кричевцементношифер» и ОАО «Красносельскстройматериалы», а также «Гродно Азот» и «Могилевхимволокно». В 2009-м та же участь постигнет «Полимир», а в 2010-м – «Гранит». И это далеко не полный перечень «китов» белорусской промышленности, которые могут пойти на дно.

Сложившаяся ситуация, естественно, ударит и по простым гражданам. Белорусское правительство ожидает, что при таком сценарии что средняя зарплата в нашей стране составит около 50% от российской. Как следствие, произойдет сокращение потребительского спроса и темпов прироста ВВП.

Исходя из этого, руководство Беларуси настаивает на пересмотре формулы, по которой рассчитывается цена на газ. Россия устами своего посла Александра Сурикова уже заявила, что делать этого не следует.

В Кремле могут, конечно, сделать скидку по политическим мотивам. Но бесплатных пирожных, скорее всего, не будет, и официальному Минску предложат отработать преференции: например, подписав многострадальное соглашение о совместной системе ПВО или признав независимость Южной Осетии и Абхазии. И куда деваться, если белорусское руководство ухитрилось прочно посадить свою страну на газовый крючок?

Во всей этой истории есть одно обстоятельство, остающееся за кадром. Украина уже сейчас получает газ по 179,5 USD за тысячу кубометров, Польша – по 320 USD, Литва – по 353 USD. И экономика этих стран не рухнула.

А вот для Беларуси 200 USD за тысячу кубометров – это уже подобно обширному инфаркту. Так что же это за «экономическое чудо», о котором нам столько лет рассказывали сам Александр Лукашенко и подконтрольные ему СМИ, если оно не в состоянии выдержать нагрузку, с коей справляются «загнивающие», по версии все тех же СМИ, соседи?

Правительственный прогноз – сродни приговору той экономической модели, которую наши власти любовно выстраивают уже 15-й год. Ее существование еще можно продлить на некоторое время, добившись очередных льгот и кредитов. Но это будет лишь отсрочка неизбежного. Нежизнеспособность «экономического чуда», автором которого считается Александр Лукашенко, становится все более очевидной.

***Игорь Потапчук, «Салідарнасць»***

## Аб'ява

Усе нумары газеты "Паходня" у фармаце PDF можна прачытаць у інтэрнэце па адрасе: http://kamunikat.org/pachodnia.html

# Кого боится Лукашенко?

Немало неудобств рядовым членам официальной белорусской олимпийской делегации доставил визит А.Лукашенко в Пекин. Как рассказали «Белорусскому партизану», когда Александр Григорьевич появился в Олимпийской деревне, у всех белорусов вдруг резко пропала мобильная связь...



*Александр и Коля Лукашенки в Пекине*

«Вначале один спортсмен пожаловался, что не может дозвониться в Минск — связь отсутствует, затем — другой, — поведали «Белорусскому партизану» спортсмены, на днях возвратившиеся из Поднебесной. — Вначале подумали, может, деньги на счету закончились — все же дороговато из Пекина названивать домой. Но в итоге выяснилось, что роуминг внезапно отключили всем, кто мог даже случайно пересечься в Олимпийской деревне с главой государства. А персонал, обслуживающий олимпийцев (волонтеров, врачей, массажистов, тренеров и т.д.) строго-настрого предупредили: на глаза президенту не попадаться, в дискуссии не вступать, лишних вопросов не задавать...

Для чего были предприняты такие беспрецедентные меры безопасности и почему Служба безопасности президента ограждает президента от своих же — не ясно. Например, достоверно известно, что в день открытия Олимпиады одна белоруска из нашей делегации сидела рядом с Тони Блэром и его женой. С другой стороны от нее тоже сидели какие-то титулованные особы. И вокруг — никаких назойливых охранников...»

Это далеко не первый случай, когда белорусский вождь пытается избежать контактов с простыми людьми. Известно, что во время встречи Лукашенко в Бресте с президентом России Дмитрием Медведевым, они посещали Беловежскую пущу. Накануне представители Службы безопасности президента не поленились обойти чуть ли не каждый двор и предупредить людей: за ворота своего забора не выходить, из окон не высовываться, в случае неповиновения — огонь на поражение. Точно также было и в Несвиже, и в других городах. А когда Лукашенко со свитой устраивает вдруг пикник на природе, Служба безопасности перекрывает все входы и выходы с прилегающих к лесной территории дачных массивов. И пока «вождь» гуляют, народ не может уехать с дач. Кстати, во время одной из пресс-конференций Лукашенко честно признался, что боится людей...

«В магазины сейчас не хожу, по улицам тоже не хожу, - сказал А.Лукашенко, отвечая на вопрос какого-то журналиста. — После одного случая. Вот я еду на машине — ностальгия жуткая, ну страстное стремление пройти по улице, никого не трогая! Просто пройти с людьми. Но, во-первых, это невозможно. Я однажды, года три назад, а может, пять лет тому назад, вышел со своей резиденции, неожиданно даже для Службы безопасности. И с Октябрьской площади в сторону цирка пошел пешком. Вокруг, конечно, работала служба безопасности — они ж головой отвечают за президента! Они начали там шевелиться. Я обернулся и чего-то там их упрекнул, одернул их. Голос у меня такой узнаваемый, сразу люди на остановке повернулись. Девчонка с парнем на остановке стояли. Сразу: «А! Президент!» Я не успел дойти до цирка - выстроилась целая демонстрация! Люди оборачивались: что за демонстрация? Видят - во главе президент. По телевизору никто не объявлял этой демонстра-

*(Заканчэнне на ст. 6)*

# Кого боится Лукашенко?

*(Заканчэнне. Пач. на ст. 5)*

ция! Люди оборачивались: что за демонстрация? Видят - во главе президент. По телевизору никто не объявлял этой демонстрации.... Я прошел сто метров - вокруг, наверное, тысячи две человек возникло - все-таки центральная улица. Мне порвали костюм. Я уже их просил: слушайте, мне стыдно будет, сфотографирует это оппозиция, в газете появится - хоть трусы не рвите! После этого я больше пешком по улице не хожу. Был такой у меня в жизни случай... Благо, что белорусы люди цивилизованные - порвали, но совсем не сняли костюм... Поэтому я не хожу...»

Судя по всему, в Пекин, где и без того были созданы беспрецедентные меры безопасности, Лукашенко взял свои самые дорогие костюмы... "Белорусский партизан".

# Магілёў: 10000 подпісаў супраць закрыцьця Дома быту

Дзесяць тысяч подпісаў сабралі прадпрымальнікі супраць закрыцьця магілёўскага цэнтру бытавога абслугоўваньня.

Гарвыканкам 22 ліпеня пастанавіў прадаць з аўкцыёну будынак цэнтру. Чыноўнікі аргумэнтуюць закрыцьцё неабходнасьцю рэканструкцыі будынка. З афіцыйных крыніц вядома, што пасьля рамонту Дом быту стане часткай гандлёва-забаўляльнага цэнтра. Сабраныя подпісы прадпрымальнікі зьбіраюцца паслаць прэзыдэнту й ва ўрад.

Будынак Дома быту знаходзіцца ў цэнтры Магілёва, акурат насупраць гарвыканкаму. Яго ўзьвялі ў 1973 годзе і дагэтуль ні разу не рамантавалі. Ва ўправе маёмасьці кажуць, што рамантаваць будынак зьбіраюцца два гады. Што ўзамен прапануюць прадпрымальнікам? Гаворыць супрацоўніца ўправы: "Кожны на гэты час хоча мець памяшканьні ў цэнтры, гэта ж ідэальны варыянт. Мы ўсе віды гэтых паслуг захоўваем і тыя плошчы, якія яны займаюць, яны будуць мець права ўдзельнічаць у рэканструкцыі і атрымаць гэта ва ўласнасьць альбо па сканчэньні рэканструкцыі цягам трох год арэндаваць па дзяржаўных стаўках".

Прадпрымальнікам гарвыканкам паведаміў, што пастанова пра продаж Дома быту з аўкцыёну дзеля яго рэканструкцыі прынятая сёлета 22 ліпеня. Ці прададзены будынак, на гэты час высьветліць не ўдалося.

З матэрыялаў мясцовай прэсы вядома, аднак, што яшчэ на пачатку гэтага году гаспадаром зямельнай дзялянкі памерам у паўтара гектары, на якой месьціцца Дом быту, стала зарэгістраванае ў Менску замежнае прадпрыемства "Ларсанда". Яно атрымала права пяцідзесяцігадовай арэнды на гэтую дзялянку.

***Пошта***

# Не разумею...

Я простая жанчына, усё жыццё (за выключэннем вучобы ў тэхнікуме) пражыла ў Шклоўскім раёне. Зараз адбываецца перадвыбарная кампанія, будуць выбірацца дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь. Адным з кандыдатаў з'яўляецца старшыня нашага райвыканкама Валерый Іваноў. З усіх бакоў нясецца гвалт: які ён добры і дасведчаны чалавек, як шмат зрабіў для раёна, якога росквіту дасягнуў Шклоўскі раён пад кіраўніцтвам Іванова. Магчыма, што ўсё гэта і так, я не ведаю. Але тады ў мяне і ў шмат каго з маіх знаёмых узнікае думка: калі Іваноў так добра спраўляецца з працай старшыні Шклоўскага райвыканкама, дык навошта пазбаўляць яго гэтай працы (дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працуюць ў парламенце на сталай аснове)? Прыйдзецца шукаць новага чалавека, які пакуль яшчэ ўвойдзе ў стан спраў у раёне. На маю думку (са мной пагаджаюцца ўсе мае калегі па працы) няхай ужо Іваноў і далей працуе старшынёй райвыканкама, калі ў яго так добра атрымліваецца. А дэпутатам ён дакладна не будзе абараняць інтарэсы простых людзей, хутчэй будзе выконваць загады вышэйшага начальства. Свае словы магу спраўдзіць на простым прыкладзе: Валерый Мікалаевіч ужо быў дэпутатам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу РБ мінулага склікання, які вызначыўся і запомніўся толькі тым, што аднагалосна прагаласаваў за адмену льгот для дзяцей, пенсіянераў, навучэнцаў і "чарнобыльцаў". Вядома ж, калі ездзіш на шыкоўным аўто, то інтарэсы простых людзей ад цябе ой як далёка...

Працуйце, Валерый Мікалаевіч, лепш на пасадзе старшыні райвыканкама...

***Еўдакія Новікава***

# Адзіны падаходны падатак увядуць, а дэкляраванне застанецца

Каля 80% беларусаў з наступнага года будуць плаціць большыя сумы падаткаў. З наступнага году ў Беларусі будзе ўведзены адзіны падаходны падатак. Ён складзе 12%. Цяпер жа беларусы плацяць ад 9% да 30% у залежнасці ад даходаў. Па словах першага намесніка міністра фінансаў Андрэя Харкаўца, прымяненне адзінай стаўкі дазволіць зменшыць страты бюджэту ў параўнанні з цяперашнімі.

З тым, што бюджэт Беларусі выйграе ад такіх зменаў, згодны і эканаміст Леанід Злотнікаў. Аднак на яго думку, адбудзецца гэта таму, што раней сярэдні падаходны падатак па Беларусі складаў 10%. Цяпер жа ён павялічыцца на 2%: **Леанід Злотнікаў:** *“Сярэдні ўзровень падаткаабкладання быў дзесьці на ўзроўні 10%, можа, крыху большы. А зараз будзе 12%. І тут бюджэт выйграе”.*

Па падліках спадара Злотнікава, каля 80% насельніцтва нашай краіны будзе плаціць больш. А вось рэформа робіцца пад інтарэс нешматлікай забяспечанай бюракратыі, лічыць эканаміст.

**Леанід Злотнікаў:** *“Гэты падатак зроблены пад інтарэсы бюракратыі. Яна зараз атрымлівае вышэй за сярэдняе. Дырэктарат атрымлівае вышэй за сярэдняе. Ну, і частка спецыялістаў таксама вышэй за сярэдняе. Гэта змяншае для іх падатковы цяжар. І тут ёсць пэўны момнт сацыяльнай несправядлівасці”.*

У той жа час Леанід Злотнікаў бачыць і станоўчыя бакі ў новаўвядзенні. Па-першае, спросіцца сістэма збору падаткаў. Па-другое, адкрыецца ценявая эканоміка. З такой




дукай згодны і дырэктар вышэйшай школы эканомікі ў Маскве Яўген Ясін. У Расіі адзіны падаходны падатак у памеры 13% існуе ўжо з 2001 года. На думку маскоўскага спецыяліста, інстытут адзінага падаходнага падатку быў карысны ў Расіі яшчэ і таму, што адпала неабходнасць дэкларавання для большай часткі насельніцтва краіны.

**Яўген Ясін:** *“Прынесла карысць перш за ўсё тым, што сталі збіраць больш падаткаў, частка эканомікі выйшла з ценю. Адміністрацыя збору падаткаў рэзка спрасцілася. Таму што знікла неабходнасць у дэкляраванні падаткаў для пераважнай большасці насельніцтва, таму што па адзінай стаўцы падаткі налічваюцца адразу па месцы налічэння заробкаў”.* Аднак, па інфармацыі прэс-сакратара Міністэрства падаткаў Сяргея Шкуты, у Беларусі сістэма дэкларавання застанецца, хоць і крыху зменіцца.

**Сяргей Шкут:** *“Дэкляраванне як такое будзе яшчэ. Проста яно будзе крыху відазмененае і будзе больш тычыцца льготаў – хто якія льготы атрымлівае да т.п. розніца будзе заключацца ў тым, што падатковыя вылікі ў нас давалі падатковыя агенты. А зараз гэта будзе больш па даходах, атрыманых за мяжой”.*

Па дадзеных Міністэрства статыстыкі і аналізу Беларусі, сярэдняя заработная плата беларуса ў ліпені 2008 года склала 923 тысячы рублёў. Сёння грамадзяне з такімі заробкамі плацяць ад 9% да 12% падаткаў. З увядзеннем адзінага падаходнага падатку ўсім давядзецца аддаваць 12% - а гэта 110 тысячаў рублёў. Такім чынам, сярэднему беларусу і праўда давядзецца аддаваць у дзяржаўную скарбонку больш грошай, чым раней.

Нагадаем, 15 жніўня прэзідэнт папярэдне ўхваліў праект бюджэта краіны на наступны год, па якім з 2009 года для ўсіх беларусаў падаходны падатак стане аднолькавым – 12%.

***www.euroradio.fm***

www.euroradio.fm - інтэрнэт-сайт Еўрапейскага радыё для Беларусі.

# АЛЕКСАНДР АГЕЕВ И ОЛЕГ ТРУСОВ ИЗДАЛИ КНИГУ ОБ ИСТОРИИ МОГИЛЕВСКОЙ РАТУШИ

В Могилеве вышло иллюстрированное научно-популярное подарочное издание белорусских историков Александра Агеева и Олега Трусова «Магілёўская ратуша. Гістарычны лёс і адраджэнне», пишет БелаПАН.

В 144-страничном исследовании кандидата исторических наук, доцента кафедры археологии и специальных исторических дисциплин Могилевского государственного университета имени Аркадия Кулешова А.Агеева и кандидата исторических наук, доцента кафедры истории Беларуси и музееведения Белорусского государственного университета культуры и искусств О.Трусова представлена многовековая история Могилевской ратуши в контексте белорусской и европейской истории, описывается ее строительство в XVII столетии, функционирование в XVIII—XX веках и возрождение в XXI столетии. Книга издана отделом культуры Могилевского горисполкома совместно с Музеем истории города Могилева.

О.Трусов отметил, что в сентябре 1979 года начал археологические раскопки на месте Могилевской ратуши с целью восстановления этого памятника архитектуры. Теперь памятник полностью возрожден при высоком качестве восстановительных работ. «Очень важно, что в здании ратуши предполагается размещение экспозиции Музея истории города Могилева», — сказал О.Трусов. По его словам, восстановление Могилевской ратуши, которая является самым большим зданием такого типа в стране, стало знаковым событием национального значения. «В своей книге мы впервые представили прошлое Могилева через историю его ратуши», — отметил О.Трусов. Он выразил признательность властям города за то, что они не пожалели средств на издание книги и включили в нее ранее нигде не публиковавшиеся слайды ученого по материалам его археологических исследований на месте ратуши в конце 1970-х — начале 1980-х годов.

Восстановление Могилевской ратуши согласно проекту, основанному на материалах археологических раскопок и исторических исследований, было осуществлено в период с августа 2007 года по 3 июля 2008 года.

В конце XVII века ратуша представляла собой кирпичное двухэтажное здание размером 28 на 10,5 м с восьмигранной пятиярусной башней в центре главного фасада строения. Башня высотой 38 метров, возведенная в 1692 году, стала вертикальной доминантой города. Украшенная балконом с металлическими решетками и большими часами, она завершалась граненым куполом со шпилем. В оконные проемы башни были вставлены оловянные рамы с небольшими овальными стеклами. Ратуша была покрыта плоской красной черепицей, украшена позолоченными флюгерами на фронтоне, крыше крыльца и шпиле башни. В 1773 году здание было перестроено в стиле классицизма, а его крыша покрыта жестью. В годы Второй мировой войны ратуша сильно пострадала, а в 1957 году была снесена.



*Александр Агеев дарит свою книгу Г. Костусеву*

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА
Грамадска-палітычная газета.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна
Бялыніцкі раён, в. В.Машчаніца.
тэл. 37-110. Рэдактар Вырвіч Б.І.
Наклад. 299 асобнікаў